Арцём Арашонак



...мы верым
адзін у аднога...

# Маўчу

***Нататнічак***

Калі жыў Макіявэлі, не было тэлефону, тэлевізару і інтэрнэту. Калі жыў Ніцшэ, не было тэлевізару і інтэрнэту. Калі жыў Сартр, не было інтэрнэту. Зараз ёсць усё, але няма Макіявэлі, Ніцшэ і Сартра.

111

Французская паэзія — фужэр віна. Беларуская паэзія — шклянка гарэлкі. Так і глядзі, каб на яе хто-небудзь не паклаў кавалак чорнага хлеба.

111

Сальвадор Далі: «Мастак, ты — не аратар! Таму заціхні і пішы!»

Дзёньнік Фаіны Ранеўскай: «Тое, што актор хоча расказаць пра сябе, ён павінен сыграць, а не пісаць мемуары».

«Тое, што ў пісьменьніка на душы, ён павінен не выказваць, а пісаць». Эрнэст Хемінгуэй.

Згодны з усімі. Што тут яшчэ напішаш, пайду, пагляджу балет.

111

Вулічныя гандляркі. Быццам семкі, разыходзяцца словы.

111

Велічны кёльнскі сабор. Маю малітву заглушае адбойны малаток турэцкіх рэстаўратараў.

111

На пахаваньні геніяў мусяць гаварыць анёлы. Таму я і маўчу.

111

Цяжка жанчыне трымаць на руках дзіцё. А як Богу цяжка трымаць нашы грэшныя душы?!

111

Давід Рубэн Гальега-Гансалес пра пакуты нерухомага хлопца ў інтэрнаце: «Уся першая старонка яго першага ў жыцьці ліста была сьпісаная літарамі «М». Вялікімі і маленькімі. Ён спадзяваўся, што хоць бы адна літара з усёй старонкі будзе зразумелай. Тоўсты сшытак у дзевяноста шэсьць старонак быў сьпісаны цалкам: «МАМА МЯНЕ ДРЭННА КОРМЯЦЬ І НЕ ДАЮЦЬ КАЛЯСКУ».

Аксамітныя постмадэрністы! Ці знойдзецца верш у вашых тоўстых тамінах, які быў бы роўны гэтаму сшытку?

111

Званіў Сальвадору Далі. На тым канцы пачулася: «Абонент временно недоступен».

111

У старым парку пачак ад кандомаў пад пустымі гнёздамі крумкачоў.

111

У пакутах нараджае жанчына. У лоне шахідкі нараджаецца выбух.

111

Маці — ад Бога. Вера ў Бога — ад маці. Мы верым адзін у аднога.

111

Муха, пад’ядаючы рэшту маіх сьняданкаў, дажыла да зімы. На Каляды дзядуля адкаркаваў пляшку добрага каньяку. На водар вінаградных сьлёз прыляцела мушка. Ба-ах — і ад чатырохкрылай кватаранткі не засталося і мокрага месца.

Так і ў літаратуры. Перабіваешся драбніцамі, нікому не

перашкаджаеш. А як замахнешся на штo большае... Ба-ах. І ад цябе мокрага месца не застаецца.

111

Бабулін пакой. Устаў ноччу, каб вады напіцца ды з усяго размаху аб кут жалезнага ложку трэснуўся. Стаю, плачу, бабуля ўсхапілася, уключыла сьвятло, прытуліла да сябе, і я супакоіўся.

Жыцьцё, як пакой з дзяцінства, патрапіш на вострый кут, балюча да сьлёз, але сьвятла ўжо ніхто не запаліць, і мусіш трываць.

111

Гётэ: «Краіны Захаду і Усходу будуць разам назаўсёды».

Кіплінг: «Захад ёсьць Захад, Усход ёсьць Усход, і ім не сустрэцца ніколі».

Басё: «Заходні вецер? Усходні?
Лепей паслухаю, як шуміць
Вецер над рысавым полем».

111

Да двух гадзінаў ночы чытаў успаміны Фаіны Ранеўскай. Які я шчасьлівы, што ня быў піянерам і люблю тэатр!

111

Жанчына баіцца Бога, бо ведае ўсю таямніцу нараджэньня, а ён ведае ўсю таямніцу яе.

111

На літаратурныя вечарыны трэба хадзіць з верным сябрам. Значыць з сабакам. Так часта хочацца ўзвыць ад фальшу!

111

«Вышэйшае наканаваньне Бога — абурацца ўсяму дурному». Гётэ.

«Небясьпека для мудраца крыецца ў тым, што ён да забыцьця можа закахацца ў дурасьць». Ніцшэ.

Дурань і рады, бегае з гэтымі афарызмамі, улюбёны ў геніяў, і сьцьвярджае, што абодва былі вар’яты.

111

Гандлярка сувенірамі пра вялікага Сальвадора Далі: «Ён здрадзіў Каталоніі!» Бацька Пікаса да каранёў валасоў быў андалузцам і маляваў усё жыцьцё галубоў для гасьцёўняў. Нацыяналізм — ідэалогія сувенірных крамаў.

111

Зьбялелы салдат ляжаў на полі бою, матчына малако вярталася ў яго цела... праз рану ў сэрцы.